# ТЕОРИЯ И ИСТОРИЯ ГОСУДАРСТВА И ПРАВА

**УДК 340.15**

## РЭАЛІЗАЦЫЯ РЭФАРМАТАРСКАЙ ПРАГРАМЫ ПАРТЫІ ЧАРТАРЫЙСКІХ НА КАНВАКАЦЫЙНЫМ СОЙМЕ 1764 ГОДА

***А.В. ВАЛЕЎКА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Артыкул прысвечаны аналізу ўмоў рэалізацыі рэформ дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай на канвакацыйным сойме 1764 года. Разгледжаны абставіны, якія аказалі вялікі ўплыў на прыняцце рэфарматарскай праграмы. Выяўлены прычыны неэфектыўнасці рэфарматарскага руху ў Рэчы Паспалітай у 60-я гады XVIII стагоддзя. Разгледжана практыка дзейнасці новых дзяржаўных устаноў і зроблены высновы аб эфектыўнасці заканадаўчага рэгулявання новых кірункаў дзяржаўнага кіравання.*

***Ключавыя словы:*** *Рэч Паспалітая, рэфармаванне дзяржаўнага ладу, канвакацыйны сойм, вайсковая камісія, скарбовая камісія.*

**Уводзіны.** Перыяд кіравання Станіслава Аўгуста Панятоўскага некаторымі гісторыкамі характарызуецца назвай “адраджэнне ва ўпадку”, альбо “гады вялікіх надзей”. Менавіта ў той час сярод прагрэсіўнай часткі шляхты Рэчы Паспалітай усё больш і больш распаўсюджваліся аптымістычныя меркаванні наконт будучыні дзяржавы. Пасля застойнага для дзяржавы перыяду панавання прадстаўнікоў дынастыі Вецінаў Аўгуста ІІ і Аўгуста ІІІ узнікла рэальная магчымасць рэфармавання састарэлага дзяржаўнага ладу, які ўжо не адпавядаў патрабаванням тагачаснай сітуацыі ў Еўропе.

У першай палове XVIII стагоддзя разгарнулася барацьба паміж прагрэсіўным колам шляхты, якая выступала за шырокія рэформы, і рэакцыйнай магнатэрыяй, якая імкнулася да захавання састарэлага ладу Рэчы Паспалітай [1, с. 283]. Падтрымкі і тыя і другія шукалі не толькі ў самой Рэчы Паспалітай, але і сярод суседніх дзяржаў, у першую чаргу Расіі, Прусіі і Аўстрыі. Гэтыя абставіны мелі вялікі ўплыў на ўнутрыпалітычнае становішча ў дзяржаве і амаль не выклікалі грамадзянскай вайны.

**Асноўная частка.** Першую канцэпцыю праграмы рэформаў на сойме ў сваёй прамове прадставіў канцлер кароны А. Замойскі, падчас якой яго ўдзельнікі, відаць, у першы раз пачулі пра ідэю Мантэск’ё аб траістым падзеле ўлады [2, с. 212]. Замойскі выказаўся на карысць рэформы падаткаў і гаспадарчага развіцця дзяржавы, неабходнасці змен у становішчы мяшчан і сялянства, за незалежнасць царкоўных судоў у Рэчы Паспалітай ад Рыма. Канцэпцыя рэформаў А. Замойскага ў многім выходзіла за межы праграмы «фаміліі» [2, с. 212].

Перш за ўсё былі прыняты рашэнні, якія дазвалялі ўпарадкаваць працу сейма. У пастанове «Аб парадку сеймавання» быў замацаваны рэгламент яго работы. Так, каб падоўжыць час пасяджэнняў, была прынята працэдура працягу пасяджэнняў «пры свечках», што раней забаранялася [3, l.17]. Для вырашэння такіх пытанняў, як падаткі, пошліны і іншыя эканамічныя «матэрыялы», было прынята рашэнне аб галасаванні большасцю [3, l.18]. Такім чынам, права «liberum veto» было часткова абмежавана. Прынятая пастанова аб утварэнні на канвакацыйным сойме генеральнай канфедэрацыі на неабмежаваны час павінна была на некалькі гадоў заблакіраваць яго ўжыванне [3, l.18]. Яшчэ адна пастанова вызваляла паслоў ад сляпога падпарадкавання “інструкцыям”, перадсеймавым наказам ваяводскай і павятовай шляхты [3, l.18]. Тым самым ім надавалася права самастойна прымаць рашэнні пры разглядзе важнейшых пытанняў унутранай і знешняй палітыкі дзяржавы.

Шмат ідэй для рэформ сойма Рэчы Паспалітай было адлюстравана яшчэ ў працы С. Канарскага “Аб паспяховым вядзенні нарад” [4]. Менавіта там была прадстаўлена тэарэтычная праграма пераадолення крызісу ў дзейнасці вышэйшай прадстаўнічай установы дзяржавы.

Пастановы канвакацыйнага сойма адносна грашова-фінансавай палітыкі дзяржавы мелі адну з асноўных мэт – абмежаванне ўлады падскарбіяў. Для гэтага былі створаны спецыялізіраваныя калегіяльныя органы – скарбовыя камісіі. Рашэнні на пасяджэннях камісій прымаліся большасцю галасоў, што выключала магчымасць аднаасобнага прыняцця пастаноў адносна збору і размеркавання дзяржаўных даходаў [5, с. 185]. Пастановай сойма замацоўвалася, што пры выкананні сваіх службовых паўнамоцтваў камісары Эканамічнай Рады былі абавязаны клапаціцца пра інтарэсы дзяржавы, а не пра свае ўласныя інтарэсы, не атрым-

ліваць іншай платы, акрамя пэўнай дзяржавай за іх службу, і ва ўсіх справах кіраваццa аб'ектыўнасцю і справядлівасцю [6, с. 129]. Ужо ў першыя этапы сваёй дзейнасці скарбовыя камісіі паказалі сябе перспектыўнымі органамі дзяржаўнага кіравання. Так, згодна са справаздачай, якая адбылася на сойме 1766 года, у дзяржаўную казну паступіла 13731 тыс. злотых, з іх доля Скарбовай камісіі складала 5111 тыс. злотых [5, с. 186]. Да ўтаварэння скарбовых камісій даходы дзяржавы складалі каля 325 тысяч злотых.

Канвакацыйны сейм ліквідаваў прыватныя пошліны і ўстанавіў «галоўную пошліну», аднастайную і абавязковую для ўсіх жыхароў дзяржавы, не выключаючы шляхту, святарства і самога караля. Такім чынам, падаткі абавязаны былі выплачваць усе катэгорыі насельніцтва. Мясцовыя падаткі былі ліквідаваны, акрамя падатку на ўтрыманне дарог і мастоў, аднак і яны спаганяліся з абмежаваннямі. Змены таксама адбыліся і ў адносінах габрэйскага насельніцтва. Падатак за агульную колькасць габрэяў быў адменены, а замест гэтага яны павінны былі плаціць падушны падатак [5, с. 186]. Адбыліся і пэўныя змены ў адносінах да гарадоў: на іх карысць стала абкладацца падаткамі не толькі мяшчанства, але і шляхта, якая мела тут нерухомасць. Сойм ліквідаваў абавязак мяшчан выдзяляць бясплатна кватэры паслам на сейм і ўдзельнікам шляхецкіх з'ездаў. Ліквідаваліся ўсе прыватныя мытныя пункты і пошліны і ўводзілася так званая генеральная пошліна, якую ў адпаведнасці са спецыяльнай інструкцыяй абавязаны былі плаціць усе – ад караля і кожнага шляхціца да купца і селяніна [3, l. 78–79]. Ад выплаты новай пошліны вызваляліся толькі шляхецкія тавары, якія перавозіліся з аднаго валодання ў іншы ці на торг, а таксама тавары, што ўвозяцца з-за мяжы, але толькі ў тым выпадку, калі перавозчык (шкіпер) прысягне, што тавар прызначаны для яго ўласных патрэб, а не для продажу. З мэтай забеспячэння збору генеральнай пошліны спатрэбілася стварэнне разгалінаванай сістэмы мытных пунктаў і павелічэнне колькасці мытных служачых.

Аднак не ўся шляхта станоўча адносілася да рэфармавання сферы фінансаў і гандлю. Прыклад са Жлобінскай ярмаркі прыводзіць І. Кітурка. Пры правядзенні кірмашоў у Жлобіне права спаганяць мыта ад купцоў меў рэчыцкі маршалак пан Халецкі, і на падставе гэтага яго камісар запатрабаваў ад Ю. Арамовіча так званую салюцыю – плату за пагаршэнне становішча ў памеры 75 злотых для пана Халецкага і 15 злотых для сябе [6, с. 130]. Супэрінтэндант Рэчыцкай каморы не мог наважыцца на выплату такіх грошай і адправіўся з данясеннем у Гродна. На сваім шляху ён сустрэў рэчыцкага маршалка і «меў з ім сур'ёзную размову» [6, с. 130], але пан Халецкі адказаў, што прыняць рашэнне можа толькі на месцы. У выніку па прыездзе ў Жлобін Ю. Арамович за дазвол надглядзець купцоў вымушаны быў заплаціць пану Халецкаму 80 рублёў і яго камісару 6 злотых з дзяржаўных грошай, каб з-за страчанага часу скарб не панёс яшчэ больш вялікіх страт [6, с. 130]. На ўсіх гарадскіх варотах Жлобіна суперінтэндант расставіў стражнікаў для ажыццяўлення нагляду і праверкі належных дакументаў, каб тавары не перамяшчаліся без выплаты пошліны. Пры гэтым Ю. Арамовіч паведаміў у Скарбовую камісію аб інцыдэнце, які меў месца. Калі шляхціц Дамінік Маліноўскі са сваім слугой Тадэвушам Пшыгодскім хацелі праехаць праз аддаленыя вароты з нейкім таварам, стражнік адмовіўся іх прапусціць, паколькі яны не прад'явілі спецыяльны знак на права праводзіць воз, які павінны былі атрымаць у горадзе. У адказ на гэтае «стражнік атрымаў ад пана Маліноўскага ўдар у галаву, а затым быў моцна збіты» [6, с. 130].

Разгледжаная сітуацыя выразна паказвае ўзнікшае падчас рэфармавання сутыкненне паміж новымі поглядамі на дзяржаўную рэчаіснасць і анахранічнай шляхецкай ідэалогіяй. Многія прадстаўнікі шляхты не ўспрымалі сур'ёзна тыя змены ў дзяржаўным і грамадскім жыцці Рэчы Паспалітай, якія адбываліся ў другой палове XVIII стагоддзя. Моцная дзяржаўная ўлада ўспрымалася пануючым саслоў'ем як пагроза іх прывілеяванаму стану.

Шмат увагі на канвакацыйным сойме было звернута на абмежаванне гетманскай улады з мэтай павышэння баяздольнасці войска Рэчы Паспалітай. Першым крокам было адхіленне ад займаемай пасады кароннага гетмана Я. Браніцкага. Замест яго камандуючым каронным войскам быў прызначаны А. Чартарыйскі, які выконваў абавязкі генеральнага рэгіментарыя кароннага [5, с. 185].

Акрамя таго, былі створаны вайсковыя камісіі, якія займаліся пытаннямі, звязанымі з камплектаваннем войска і яго матэрыяльным забеспячэннем. Аднак для Вялікага Княства Літоўскага вайсковая камісія не была ўтворана, бо супраць такога органа выступаў гетман М. Масальскі, які адначасова падтрымліваў партыю Чартарыйскіх [2, с. 213]. Пытанне аб літоўскай ваеннай камісіі зноў разглядалі падчас каранацыйнага сойма. Акрамя гетманскай булавы, М. Масальскі патрабаваў сабе яшчэ і пасаду віленскага ваяводы. Аднак яго патравабанні былі адвергнуты соймам, а статус літоўскага гетмана быў усталяваны як роўны кароннаму [5, с. 185].

Такім чынам, рэфармацыйныя намаганні, якія пачаліся вельмі аптымістычна, з цягам часу прыходзілі ў заняпад. Гэта было выклікана таксама і супярэчнасцямі паміж Чартарыйскімі і каралём Станіславам Аўгустам наконт некаторых пытанняў. Асабліва гэта тычылася фінансавай рэформы.

Адным з напрамкаў фінансавага аздараўлення Рэчы Паспалітай павінна было стаць утварэнне Манетнай камісіі, якая займалася пытаннямі чаканкі новай дзяржаўнай манеты. Гэтая рэформа павінна

была гарантаваць фінансавую бяспеку Рэчы Паспалітай і спыніць выкарыстанне замежнай манеты. Аднак на шляху ўдасканалення грашовай сістэмы дзяржавы рэфарматары сутыкнуліся с шэрагам супярэчнасцей [5, с. 214].

Трэба асобна разлядзець пытанне аб легальнасці рашэнняў, прынятых на канвакацыйным сойме 1764 года, а менавіта тыя спосабы, дзякуючы якім партыя Чартарыйскіх атрымала падтрымку з боку астатняй шляхты.

Падчас самой канвакацыі ў Рэчы Паспалітай знаходзіўся расійскі вайсковы корпус колькасцю 2000 чалавек. Акрамя ваенный падтрымкі Фамілія атрымала грашовую падтрымку для подкупаў паслоў на павятовых сойміках. Тадэуш Корзан піша аб тым, што грашовая падтрымка з боку Расіі налічвала два мільёны злотых [7, с. 42]. З гэтай сумы Аўгуст Чартарыйскі атрымліваў 3000 дукатаў у месяц, 500 000 злотых былі прызначаны для прымаса Люблінскага. Адам Чартарыйскі браў грошы з замежнай падтрымкі для подкупу соймікаў (напрыклад, на подкуп Галіцкага сойміка ім было затрачана 1000 дукатаў) [7, с. 42]. Чартарыйкія былі не першымі, хто намагаўся атрымаць падтрымку з дапамогай подкупу. Такая практыка была распаўсюджана сярод шляхты і была неад’емнай часткай “шляхецкай дэмакратыі”. Узровень карупцыі ў Рэчы Паспалітай быў вельмі высокі.

Таксама падчас канвакацыі пасяджэнне сойма пакінулі шмат прыхільнікаў кансерватыўных рухаў сярод шляхты. Гэта дало магчымасць рэфарматарам атрымаць большасць пры прыняцці рашэнняў. На пасяджэнні сойма, як адзначае Т. Корзан, з Пасольскай ізбы было 80 чалавек, а сенатараў толькі 7, пры фармальнай колькасці палат 300 і 136 адпаведна [7, с. 44]. Некалькі іншыя лічбы прыводзіць Х. Шміт: “з 61 сенатара пакінулі сойм 27 чалавек, а з 191 пасла – 60 чалавек [5, с. 154]. Такое разыходжанне ў гістарыяграфіі выклікана палітычнымі супярэчнасцямі адносна пытанняў законнасці правядзення канвакацыйнага, элекцыйнага і канвакацыйнага соймаў 1764 года. Асабліва гэта бачна ў польскіх крыніцах. Праекты рашэнняў канвакацыйнага сойма прымаліся амаль без галасавання і ўхваляліся прымасам Люблінскім нягледзячы на фармальнасці [7, с. 44].

Гэтыя факты могуць накіраваць на думку, што рашэнні канвакацыйнага сойма 1764 года немагчыма лічыць легітымнымі па прычыне вельмі малога прадстаўніцтва шляхты на ім. Аднак, аналізуючы гэты момант, трэба мець на ўвазе, што ў палітычнай традыцыі Рэчы Паспалітай колькасць выбаршчыкаў на сойме не мела прынцыповага значэння, галоўным было аднагалоссе ў прыняцці рашэння [5, с. 167]. Таму для XVIII стагоддзя сітуацыя ўспрымалася не так, як у сучаснасці. А калі яшчэ мець на ўвазе вайсковую падтрымку з боку Расійскай імперыі, то можна зрабіць выснову, што іншыя варыянты развіцця падзей, звязаных з соймамі 1764 года, былі малаверагодныя.

Працэс прыняцця рэфармацыйных рашэнняў падчас канвакацыйнага сойма 1764 года можна ахарактарызаваць як спантанны і не зусім паслядоўны. Рашэнні прымаліся ў вельмі складаных абставінах. З аднаго боку, неабходнасць змен у дзяржаўным ладзе была відавочна, але не была канчаткова распрацавана стратэгія ажыццяўлення рэформ. Нават сярод рэфарматараў не было адзінага меркавання па некаторых пытаннях, што было выклікана супярэчнасцямі інтарэсаў. Прыкладам можа быць узгаданая вышэй сітуацыя з вайсковай камісіяй у Вялікім Княстве Літоўскім. Ідэалагічны падмурак рэфармавання таксама быў яшчэ не поўнасцю сфарміраваны. Толькі далейшая рэформа адукацыі дала магчымасць шырокаму распаўсюджанню сярод шляхты ідэй Асветніцтва наконт дзяржаўнага і грамадскага парадку. І гэтая рэформа была праведзена ў асноўным у сувязі з узнікшай неабходнасцю замяшчэння адукацыйнай ролі ордэна езуітаў, які быў лівідававаны ў другой палове XVIII стагоддзя.

**Заключэнне.** Спантаннасць і непаслядоўнасць рэфармацыйных памкненняў прадстаўнікоў прагрэсіўнай часткі шляхты на чале з Чартарыйскімі, а таксама ўзнікшыя спрэчкі ўнутры самой партыі абумовілі няўдачы ў працэсе рэалізацыі праграмы рэфармавання дзяржаўнага ладу.

Таксама сваю негатыўную ролю адыграла адсутнасць адзінай стратэгіі ў партыі Чартарыйскіх. Іх спробы заручыцца падтрымкай Пецярбурга былі хутчэй вымушанымі, бо ў самой Рэчы Паспалітай яны былі ў меншасці. У перспектыве іх дзеянні паказалі яшчэ адну слабасць дзяржаўнага ладу “дзяржавы абоіх народаў” – падлегласць знешняму ўплыву.

Такім чынам, шляхта, абараняючы свае правы, і раней звярталася да замежняй падтрымкі, але ў сярэдзіне XVIII стагоддзя гэта праявілася найбольш яскрава. Прусія, Аўстрыя і Расійская імперыя атрымалі значны ўплыў на знешнюю і ўнутранюю палітыку Рэчы Паспалітай. Рэформы 1764 года можна параўнаць з зернем, якое ўпала на непадрыхтаваную глебу і дало вельмі мала плёну.

ЛІТАРАТУРА

1. Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапамож. : у 2 ч. / Я.А. Юхо. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – Ч. 1. – 352 с.

2. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2007. – Т. 3 : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). – 344 с.
3. Volumina legum. – Petersburg : Nakiadem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. – T. VII. – 415 s.
4. Konarski, S. O skutecznym rad sposobie i inne pisma polityczne / S. Konarski. – Wrociaw : Zakiad Narodowy im. Ossolicskich – Wydawnictwo ; Warszawa : we swpyipr. z De Agostini Polska, cop. 2005. – 347 l.
5. Носов, Б.В. Установление российского господства в Речи Посполитой. 1756–1768 гг. / Б.В. Носов ; отв. ред. В.К. Волков. – М. : Индрик, 2004. – 728 с.
6. Китурко, И.Ф. Скарбовая комиссия ВКЛ и реорганизация таможенной службы в 1765–1772 гг. / И.Ф. Китурко // Гістарычна-археалагічны зб. ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; пад рэд. А.А. Кавалені [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 129–139.
7. Korzon, T. Wewnetrzne dzieje Polski za Stanislawa Augusta (1764–1794) badania historyczne zestanowiska ekonomicznego i administracyjnego. T. 4 / T. Korzon. – Krakyw : KsiкgarniaL. Zwolicskiego i S-ki ; Warszawa : naki. Ksikgarni Teodora Paprockiego i S-ki, 1897. – 513 l.

*Пастуніў 12.04.2018*

## THE IMPLEMENTATION OF THE REFORM PROGRAM OF THE PARTY OF CZARTORYSKI IN THE PROFESSIONAL AREAS OF THE SEJM OF 1764

***A. VALIAUKA***

*This article analyzes the implementation of the conditions of the state system reform Rzeczpospolita on konvokatsionnom Diet 1764. Having considered the circumstances that had a great influence on the adoption of reform programs. The causes of the ineffectiveness of the reform movement in the Polish-Lithuanian Commonwealth in the 60th. XVIII century. We consider the practice of the operation of new public institutions and make conclusions about the effectiveness of legislative regulation of new areas of public administration.*

***Keywords:*** *Rzeczpospolita, reform of the state, konvokatsion diet, military commission, treasure commission.*